CENTRALNA
KOMISJA
EGZAMINACYJNA

# EGZAMIN MATURALNY
## OD ROKU SZKOLNEGO 2014/2015

# JĘZYK BIAŁORUSKI
## POZIOM PODSTAWOWY

**PRZYKŁADOWY ZESTAW ZADAŃ**

**Czas pracy: 170 minut**

**GRUDZIEŃ 2013**

**Заданне 1.**

Вольга Чайкоўская

## ПАГЛЫБЛЕННЕ Ў ТРАДЫЦЫЮ

Чаму не варта забываць пра сваю культурную спадчыну. […] Здаецца, для беларусаў гэтая тэма заўжды актуальная. […]

Што такое этнічная музыка? Гэта музыка, перанятая вусным шляхам […] ад «майстра» – носьбіта традыцыі. У этнамузыцы важная сувязь з мясцовай традыцыяй, […] тым больш што на Беларусі аўтэнтычны фальклор захаваўся ў фоназапісах, відэафільмах і часам яшчэ ў жывым бытаванні. Некаторыя з нас слухалі легендарных Сцяпана Дубейку і Ганну Вянгуру […]. Яны – самародкі […].

Традыцыйная музыка – гэта асобная культура: каб яе асэнсаваць і далучыцца да яе, трэба прыкласці пэўныя намаганні і патраціць пэўны час, які ў сучаснага чалавека не заўсёды ёсць. […]

Сапраўды, ёсць шмат пытанняў па ўспрыманні сучасным чалавекам музыкі, якая зарыентавана на традыцыйны лад жыцця і традыцыйнае мастацтва. Але тут замкнёнае кола. Калі гэтага мастацтва не будзе ў медыйнай прасторы, мы яго ніколі не палюбім. Традыцыйная культура павінна захоўвацца – дзеля таго, каб захоўваўся этнас. […] Сучасная навука даказала – калі няма традыцыйнай культуры, фальклору, спеваў, этнічнай музыкі – народ непазбежна загіне і знікне з гістарычнай арэны. А таму першы, хто павінен клапаціцца пра захаванне традыцыйнага мастацтва – гэта дзяржава, якая будзе існаваць, толькі пакуль яе грамадзяне будуць адчуваць сябе асобным народам.[…]

Безумоўна, без падтрымкі грамадства гэта немагчыма. Як і без істотнай падтрымкі дзяржавы таксама. Таму што, каб займацца мастацтвам – трэба мець вольны час і сродкі. Носьбіты традыцыйнай культуры ў свой час забяспечвалі сябе працай на зямлі. Сучасны чалавек мае значна менш вольнага часу на творчасць. […]

Першая прыступка да таго, каб захаваць нашую традыцыйную культуру – трэба захоўваць яе ў структурах паўсядзённасці. Калі з маленства дзіця будзе чуць этнічную музыку ці будзе ездзіць з бацькамі ў вандроўкі, адзначаць традыцыйныя святы, то з часам у яго сфарміруецца натуральная патрэба ў традыцыйнай культуры, і пасталеўшы, ён міма гэтага ўжо не пройдзе.

Вельмі небяспечна, што мы не маем менеджменту і маркетынгу, якія мэтанакіравана працавалі б на папулярызацыю этнічнай культуры і выводзілі яе на міжнародны ўзровень. Куды знікаюць менеджары культуры? Мы кожны год выпускаем менеджараў, якія, быццам бы, павінны папулярызаваць культуру беларусаў, праводзіць маркетынгавыя даследаванні. Але, напэўна, падчас навучання іх недастаткова паглыбляюць у этнатрадыцыю. Да таго ж у моладзі ўсё адно ёсць жаданне хуткіх грошай, заробку: маўляў, навошта корпацца з этнічнай культурай, калі можна правесці […] канцэрт танцавальнай музыкі – больш аголенага цела, […] шампанскага і піва – гэта ўсё добра акупляецца. […]

http://zviazda.by/2013/09/13284.html

**Заданне 1.1. (0–1)**
Пастаў тэзіс да тэксту.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 1.2. (0–1)**
Растлумач, як разумееш сцвярджэнне аўтара: *паміж традыцыйным мастацтвам, а існаваннем народа замкнёнае кола*. Карыстайся 4 абзацам.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 1.3. (0–3)**
Растлумач значэнне дадзеных слоў:

а) самародкі –

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

б) этнас –

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

в) менеджар –

.............................................................................................................................................

**Заданне 1.4. (0–2)**
На аснове тэксту адкажы, якія адносіны мае аўтар да прадстаўленай праблемы, абгрунтуй свой адказ.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 1.5. (0–1)**
На аснове шостага абзаца акрэслі погляд аўтара на прадстаўленую праблему.

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

Уладзіслаў Сыракомля

## ДА ЗЫЧЛІВАГА ЧЫТАЧА

Вельмі незвычайную кніжку прыношу табе, чытач: падарожжа па ваколіцы ў акружнасці пяці ці шасці міль[1] ваколіцы, якая нічым адметным не вылучаецца, якая не шмат можа ўспомніць з мінулага, а сёння зусім засталася без значэння. Аднак жа, не зважаючы на гэта, узяўся я за працу над кніжкай. Дзве галоўныя акалічнасці падштурхнулі мяне да гэтага. Першая – жаданне падзяліцца з людзьмі сваімі асабістымі ўспамінамі, за што я павінен прасіць у чытача прабачэння, бо хоць для мяне яны і дарагія, яго могуць пакінуць абыякавым. Усё ж я цешу сябе надзеяй, што, мажліва, і не шмат, але знойдуцца чулыя сэрцы, якія, перажыўшы прыкладна тое ж, што і я, патрапяць і захочуць мяне зразумець.

Ваколіцы, якія я назваў тут сваімі, адыгралі найважнейшую ролю ў маім жыцці. Малым дзіцем трапіў я сюды, і тут, у радыусе[2] некалькіх міль, прайшло ўсё маё маленства, юнацтва і сталыя гады, тут зведаў я ўсе чалавечыя пачуцці – ад хлапчуковай радасці, калі ганяўся за матылём, і да сардэчнага болю, калі як бацька плакаў над магілкамі дзяцей. Гэтае сціплае мястэчка было першым горадам, які бачыў я ў жыцці, у гэтым ціхім касцёле пачуў я першы раз голас арганаў, прыняў там першае святое прычасце, якраз там на школьнай лаве ўпершыню пакаштаваў я пладоў навукі, там пад ценем вясковага алешніку, каля крыніцы пачаў я прычыняцца да высокага святла паэзіі і марыць пра нязнанае яшчэ пачуццё кахання; у гэтым старажытным замку я ўвайшоў юнаком у кола таварыскага жыцця, у гэтай святыні ўзяў я шлюб, а потым у гэтай наднёманскай ваколіцы з Богам і кніжкай ступіў на пісьменніцкую дарогу, устанавіў ганаровыя для мяне і дарагія сэрцу адносіны з далёкім светам, тут, у першароднай цішыні, пад уражаннем прыроды і сямейнага жыцця вольна снаваў я ўток маіх думак. Што ж за дзіва, калі гэтыя ваколіцы сталі для мяне святымі, што прырос я сэрцам да кожнай мілай майму сэрцу касцельнай вежачкі, да кожнага ўзгорка на полі, крыжыка на дарозе, да кожнага дрэўца і кусціка, да амаль кожнай аблачынкі на небе!

Той, хто палюбіў так свае ваколіцы, знайшоў у іх, здавалася б, сваё шчасце.

Ды дзе там! Калі не знайшоў гэтага шчасця ў сабе, дарэмна шукаць яго ў знешнім свеце. Два балючыя ўдары лёсу, два непаразуменні з людзьмі – і старана, такая дарагая некалі сэрцу, стала для нас невыноснай; заставалася толькі пакінуць яе, забыўшыся на ўсё добрае, узяўшы з сабой толькі апошнія горкія ўспаміны. Добрае было сном і ілюзіяй, горкае ж – рэальнасцю. [...]

У. Сыракомля, *Вандроўкі па маіх ваколіцах,* Мінск 2010, ст. 12–13.

[1] міля – мера даўжыні.
[2] радыус – адрэзак простай лініі, якая злучае цэнтр з любімым пунктам паверхні зямнога шара.

**Заданне 1.6. (0–1)**
На аснове тэксту адкажы, што натхніла аўтара да напісання сваёй кніжкі?

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

**Заданне 1.7. (0–2)**
Падай чатыры аргументы, якія даказваюць, што ваколіцы, пра якія расказвае аўтар, з'яўляюцца яму вельмі блізкімі.

1. ..............................................................................................................................

2. ..............................................................................................................................

3. ..............................................................................................................................

4. ..............................................................................................................................

**Заданне 1.8. (0–1)**
Да пададзенага фрагмента тэксту У. Сыракомлі складзі план у трох пунктах.

1. ..............................................................................................................................

2. ..............................................................................................................................

3. ..............................................................................................................................

**Заданне 1.9. (0–1)**
У якім стылі напісаны абодва тэксты?
**а)** навуковым
**б)** гутарковым
**в)** публіцыстычным
**г)** мастацкім

Адказ:

Тэкст 1 ..................................................

Тэкст 2 ..................................................

**Заданне 2.**
**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 2.1.: Лаяльнасць перад самім сабой, ці ў адносінах да бацькоў? Абмяркуй праблему і абгрунтуй свой погляд, адклікаючыся да ніжэй пададзенага фрагмента тэксту *Пінская шляхта* Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і цэлага твора. Твая праца павінна налічваць не менш чым 250 слоў.**

М а р ы с я (седзячы на лаўцы, прадзе і прыпявае) […]

Ой, так! Няхай ганіць бацька, няхай лае маці, а я люблю Грышку і любіць яго век буду. Ой, бедныя ж нашы галованькі!.. Што гэта за дур напаў на бацькоў? П'яныя завяліся ды пабіліся з сабою за шляхецтва, а мы з Грышкам праз тое гаруем і ныем. Яго бацька падаў на майго ў суд скаргу, і сягоння прыедзе ў ваколіцу найяснейшая карона на прасоку. У ім цэлае наша спасенне. Як прыедзе, дык мы з Грышкам паклонімся яму ў пояс ды будзем прасіць ды маліць, каб ён пагодзіў нашых бацькоў ды каб яны дазволілі нам пажаніцца. […]

Г р ы ш к а. Дык я ж і прасіць не буду, сам цябе пацалую. (Цалуе яе.)

М а р ы с я. Ах, Грышка, нядобры! Як ты спалохаў мяне, гневаюся не жартам!..

Г р ы ш к а. Гневаешся? Няпраўда! А чаму ж ты на мяне так міленька пазіраеш?

М а р ы с я. Так, са злосці!.. Нягодны, дзе ты забаўляўся? Гэта ж зараз прыйдуць бацькі, а мы так многа маем з табою перагаварыць.

Г р ы ш к а. Выбачай, мілая Марыся, − чуць золак, я з'ездзіў ужо да места, кінуўся ў ногі асэсару і прасіў, каб ён узяў нас пад сваю апеку.

М а р ы с я. Трэба было завезці які гасцінчык.

Г р ы ш к а. Дык я ж завёз яму двух зайцоў, тры пары цецерукоў ды кадобчык мёду. Ён усе прыняў ласкава і сказаў, што сёння ж прыедзе на разборку справы майго бацькі з тваім. Ой, наварылі бацькі сабе кашы, будзе што есці! Ён вельмі сярдзіты, − бо адзін вус калом угору стаў. Будзе вазня!

М а р ы с я. Дай Бог, каб гэта каша нам зубоў не папрышчыла!

Г р ы ш к а. Ён дакляраваў зрабіць нам вяселле. На Богу ды на ім − уся наша надзея.[…]

Ц і х о н. Хрэн табе ў вочы! Добра табе прастарэкаваць, калі няма на шыі бяды. Ось скажы лепш, што рабіць? Пане Куторга, ты ж такі пісьменны чалавек, − можаш падаць разумную раду.

К у т о р г а. А прымеце ж чэсна маіх сватоў да вашай Марысі? […]

Ц і х о н. Добра, пане Куторга, − бяры сабе дачку, і пасаг дам, толькі зрабі ласку: выцягні з бяды. […]

К у л і н а. Памагайце толькі майму Ціхону, а ўжо Марыся будзе ваша; я ёй сама ладам напілую вушы... Пойдзем, Ціхон, прыгатуемся, каб па-гаспадарску прыняць найяснейшую карону. А ты, пане Куторга, пачакай, − зараз прышлю Марысю. (Выходзіць з Ціхонам.) […]

К р у ч к о ў.[…] Ну, Марыся, хадзі сюды, пабліжэ, дык кажы мне шчырую праўду, – ты ж бачыш, што ў мяне вусы не натапыраны, дык я не сярдзіты, – кажы: любіш ты Грышку Ліпскага?

М а р ы с я (саромячыся і перабіраючы фартушок). Ну, дык што?..

К р у ч к о ў. За што ж ты яго палюбіла?

М а р ы с я. Сама не ведаю, – вот так штось прыпаў к сэрцу. Ды як жа яго не любіць, калі ён малады, прыгожы хлопец, а сэрца ў яго залатое.

К р у ч к о ў. Дык хош за яго замуж выйсці?

М а р ы с я (з сарамлівасцю). Але, хочу... калі за яго не пайду, то ўжо век мне, беднай, гараваці дзеўкай. Найяснейшая карона! Злітуйцеся над намі ды сатварыце наша шчасце! (Кланяецца яму.)

К р у ч к о ў. Чаго ж ты хочаш ад мяне?

М а р ы с я. Найяснейшая карона! Скончыце дзела няшчаснае між нашымі бацькамі не па-судоваму, а па хрысціянскаму абычаю: пагадзіце іх з сабою, – няхай больш не індычацца, ды прымусьце, каб яны нас з Грышкам злучылі. Найяснейшая карона! (Кланяецца яшчэ ніжэй і жаласліва кажа далей.) Ты ж такі, хоць чалавек судовы, чыноўны, ды, пэўна, верыш у Бога, – дык дзеля ласкі Божай сатвары ты нам ласку, зладзь нашае шчасце, а мы век будзем за цябе, тваіх дзетак і ўнучкаў Бога прасіць.[…]

В. Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*, [у:] Вольга Сянкевіч, Яланта Грыгарук, *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ,* Варшава 2001, ст. 57–73.

**Тэма 2.2.: Зрабі аналіз верша. Пастаў інэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш чым 250 слоў.**

Максім Багдановіч

***Слуцкія ткачыхі***

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы[3]
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, -
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам зззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага ўзора,
Цвяток радзімы васілька.

1912

М.Багдановіч, *Слуцкія ткачыхі,* [у:]*З васільковых крыніц*, Яланта Грыгарук, Варшава 2003, ст. 176.

[3] **Залатыя паясы** – гэта слуцкія паясы, якія ткалі ў радзівілаўскай мануфактуры ў XVIII-ым і XIX-ым стагоддзях

# WYPRACOWANIE

**na temat nr ...........**

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................................

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***